Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№ 69 (28433)

12 КРАСАВІКА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12

Хутар пад знос

МС

Будні сельскага доктара

МС

Як павысіць урадлівасць глебы?

СТАР. 16

Час рупіцца і працаваць

ПРЭЗІДЭНТ ПРА ПАСЯЎНУЮ, МАДЭРНІЗАЦЫЮ ДРЭВААПРАЦОЎКІ, БІЗНЕС І ПАДЗЕІ Ў СВЕЦЕ

Падчас рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на дзве тэмы. Першая — традыцыйная для вясновай пары — пасяўная кампанія. Другая — стан і перспектывы развіцця дрэваапрацоўчай галіны, у мадэрнізацыю якой дзяржава ўкладвае істотныя сродкі.

Аляксандр Лукашэнка, знаёмячыся з ходам вясновых палявых работ у саўгасе «Выток» Рэчыцкага раёна, цікавіўся, ці дастаткова сховішчаў для насення, якія ёсць праблемы па пасяўной, ці хапае мінеральных угнаенняў, паліва. Кіраўнік дзяржавы асабліва закрануў тэму эканомнага і беражлівага стаўлення да рэсурсаў. «Давядзіце да ўсіх: эканомія павінна быць вельмі жорсткай, — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка. — Навядзіце парадак са спажываннем паліва». Што да мінеральных угнаенняў, то павінна быць тэхналагічная дысцыпліна іх выкарыстання. Каб каштоўныя дабаўкі не гінулі дарма, іх неабходна выкарыстоўваць строга па правілах — у патрэбны час.

Для знаёмства з ходам мадэрнізацыі ў сферы дрэваапрацоўкі Аляксандр Лукашэнка наведаў прадпрыемства «Рэчыцадрэў», дзе пакуль адпаведны працэс не завяршыўся.

СТАР. 2

У галубятні, якую жыхар Пружан Сяргей БУЗА пабудаваў у двары свайго шматпавярховага дома ў цэнтры горада, сёння жыве каля сотні птушак. Сяргей прызнаецца, што гэта яго спраўджаная мара дзяцінства. Любоў да жывых істот ён перадаў і сваім сынам: старэйшы працуе кінолагам, малодшы — вучыцца на ветэрынара. Цікавяцца птушкамі і клопатам пра іх і суседскія хлапчукі.

Фота БЕЛТА.

ДЗВЕ СОТНІ КРЫЛАЎ

■ Блізкі космас

БЕЛАРУСКІ КАРАЛЁЎ

Як кіруюць айчынным спадарожнікам сувязі?

Больш за год таму Беларусь займела ў касмічнай прасторы сваё другое «прадстаўніцтва» — спадарожнік Белінтэрсат-1 быў выведзены на арбіту кітайскай ракетай-носьбітам «Чаньчжэн-3В» (у перакладзе — «Вялікі паход»). Ад першага айчыннага касмічнага апарата ён адрозніваецца кардынальна. У першую чаргу па прызначэнні, задача сатэліта — аказваць тэлекамунікацыйныя паслугі: спутнікавае тэле- і радыёвяшчанне, доступ у інтэрнэт... Для кіравання спадарожнікам у вёсцы Станькава быў створаны наземны комплекс кіравання і невялікі «касмічны гарадок». Напярэдадні Дня касманаўтыкі карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў «беларускім Каралёве» і паназіралі, як апаратам паспяхова кіруюць нядаўнія студэнты.

СТАР. 4

Усе антэны скіраваны ў бок экватара — менавіта там знаходзіцца беларускі спадарожнік сувязі.

Фота Надзеі БУЖАН.

«ПАРАТРУПЕР» — БУДЗЕ СУПЕР?

У красавіку пачнуць працаваць атракцыёны. Ці ўсе з іх парадуюць шматтысячную армію наведвальнікаў? Зараз работнікі Дзяржпрамнагляду інспектуюць беларускія забаўляльныя машыны. Бо толькі той агрэгат, які спраўны на 100%, зможа атрымаць допуск да работы. Аб тым, што хаваецца па іншы бок забаўляльных канструкцый, карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з галоўным дзяржаўным інспектарам упраўлення нагляду за бяспекай пад'ёмных збудаванняў і атракцыёнаў Дзяржпрамнагляду Сняжанай КАЗАЕВАЙ.

5 метраў у секунду

У маі 2009 года нагляд за атракцыёнамі быў перададзены дэпартаменту па ўказанні Прэзідэнта. Але не за ўсімі. Тэхнічныя характарыстыкі рэгламентуе п. 6 дадатка 2 Закона «Аб прамысловай бяспецы». Напрыклад, сярод механізаваных агрэгатаў інспектары Дзяржпрамнагляду сочаць за тымі, якія рухаюцца па гарызанталі з хуткасцю, большай за 3 метры ў секунду для дзіцячых атракцыёнаў і 5 — для дарослых. Для тых жа, якія падымаюць наведвальнікаў угару, таксама ўстаноўлены ліміт: канструкцыі, якія ўзнімаюцца на вышыню больш за 2 метры для дзіцячых і 3 — для дарослых. А водныя горкі трапляюць на дзяржаўны ўлік тады, калі пасажыры на іх разганяюцца больш за 5 метраў у секунду, і калі адносная вышыня спуску на іх больш за 3 метры.

Наколькі высокі знос?

156 з 269 падкантрольных нам канструкцый па ўсёй краіне ўжо перайшлі мяжу нарматыўнага тэрміну эксплуатацыі. Для кожнага атракцыёна вызначаны свой паказчык. Увогуле межы яго складаюць ад 10 да 25 гадоў. Што адметна, па працэнтных суадносінах тут лідзіруюць перасоўныя атракцыёны. «На пенсію» надышоў час адправіць 34 з 39 такіх канструкцый, якія былі выпушчаны яшчэ ў 1990-х гадах. У лічбавых жа суадносінах пальма першынства належыць механізаваным канструкцыям. Такіх назбіралася 116 са 195. Цікава, што самы стары атракцыён у Беларусі працуе ажно з 1963 года! Гэта кола агляду ў Бабруйску. Па адным «ветэране» з савецкіх часоў засталося дагэтуль у Гомелі і на Міншчыне.

СТАР. 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Пётр ПРАКАПОВІЧ, старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва:

«Рабочая група, створаная па рашэнні кіраўніка дзяржавы ў мэтах стымулявання дзелавой актыўнасці і выключэння залішніх патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да суб'ектаў гаспадарання, а таксама для далейшага ўдасканалення кантрольнай і нагляднай дзейнасці, зрабіла каласальную работу. Рашэнне аб накіраванні на грамадскае абмеркаванне новых дакументаў яшчэ больш прыцягне ўсіх прадпрымальнікаў, дзелавых людзей, эканамістаў. Усе ахвотныя змогуць унесці свае прапановы. Спадзяюся, што ў выніку такога абмеркавання і з улікам напрацаваных матэрыялаў мы атрымаем вельмі добрыя нарматыўныя дакументы, якія будуць стымуляваць развіццё эканомікі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.04.2017 г.

Долар ЗША	1,8966	▼
Еўра	2,0085	▼
Рас. руб.	0,0333	▲
Укр. грыўня	0,0705	▼

ISSN 1990 - 763X

17069

Час рупіцца і працаваць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«У свой час мной было прынята рашэнне аб мадэрнізацыі дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, — нагадаў Прэзідэнт. — Гэта пацягнула за сабой і мадэрнізацыю мэблевых прадпрыемстваў». Аляксандр Лукашэнка прывёў словы віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашкі, які займаўся ва ўрадзе мадэрнізацыяй: калі б тады не было прынята рашэнне аб мадэрнізацыі нашых дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, яны сёння не існавалі б — ні адно прадпрыемства. Яны б памерлі на рынку, ніхто б не набываў прадукцыю. «Дзякуй богу, што ў свой час схамянуліся, прынялі рашэнне па мадэрнізацыі, сыходзячы з таго, што ў нашай краіне ёсць сыравіна», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падчас наведвання «Рэчыцадрэва» падкрэсліў чарговы раз: забяспечыць людзям сярэднюю зарплату па краіне ў 1000 рублёў — стратэгічная задача для ўлады.

«Я настойваю на гэтым не таму, што нейкі страх перад людзьмі, што недзе ў вас тут у Рэчыцы 15 чалавек выйшлі на плошчу, — сказаў Прэзідэнт. — Не ў гэтым справа. 1000 рублёў — гэта той мінімум, які мы павінны дапамагчы людзям зарабіць. А далей — варушыцеся самі ў сваіх калектывах. Мы будзем, натуральна, падштурхоўваць — і кіраўнікоў, і ўрад. Але гэты бар'ер, які ў нас некалі быў, трэба аднавіць — 500 з лішнім долараў мы ўжо мелі зарплату».

Кіраўнік краіны звярнуў увагу, што ў Рэчыцы невялікая колькасць непрацаўладкаваных людзей, але тым не менш і для іх важна знайсці і прапанаваць работу.

«Арганізуйцеся, у вас нядрэнны калектыў. Час няпросты, але мы ўжо бачым святло ў канцы тунеля, асабліва ў вас, на вашым прадпрыемстве», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да супрацоўнікаў «Рэчыцадрэва».

* * *

Супрацоўнікі прадпрыемства мелі магчымасць спытаць у кіраўніка дзяржавы пра тое, што іх хвалюе. Як заўсёды, Прэзідэнт даў вычарпальныя адказы.

Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы падчас наведвання «Рэчыцадрэва».

Пра развіццё і добраўпарадкаванне гарадоў

Азнаёміўшыся з Рэчыцкім раёнам з верталёта, а таксама праехаўшы па горадзе, Прэзідэнт застаўся задаволены ўбачаным, паколькі ўсюды адчуваўся гаспадарлівы падыход. «У Рэчыцы парадак, малайцы», — пахваліў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён пажартаваў, што трэба праехаць па ўсіх райцэнтрах, тады хутчэй усюды навядуць парадак.

Закрануўшы тэму добраўпарадкавання і асабістай адказнасці кожнага за тое, што адбываецца ў яго родным населеным пункце, Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што кожны па магчымасці можа ўнесці ўклад у тое, каб яго малая радзіма была дагледжанай і прыгожай.

Адказваючы на пытанні працаўнікоў калектыву, кіраўнік дзяржавы пазітыўна ацаніў перамены, што адбыліся тут, і выказаў упэўненасць у добрых перспектывах развіцця прадпрыемства.

Пра развіццё бізнесу

«Мы ствараем умовы для людзей. Гэта дало вельмі моцны штуршок не толькі ў раённых цэнтрах, нават у аграгарадках і пасёлках. Зараз самім людзям трэба варушыцца. У найбліжэйшы час мы прымем рэвалюцыйныя рашэнні па прадпрымальніцтве, па бізнесе. Ты прыйшоў, заяву пакінуў, што хочаш займацца гэтай справай, у падатковай інспекцыі зарэгіструешся — і пайшоў працаваць. Пажарнікі, санстанцыя — усё будзе скарочана да мінімуму. Рашэнне прынята, у найбліжэйшы час нарматыўна-прававы акт ляжа на стол да Прэзідэнта, і мы цалкам разняволім гэтую ініцыятыву».

Галоўнае — гэта жыццё і бяспека людзей. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: кіраўнікам будуць дадзены ўсе неабходныя правы і паўнамоцтвы, у той жа час і поўную адказнасць будуць несці менавіта яны.

Пра падзеі ў Сірыі

Цікавіліся прадстаўнікі калектыву «Рэчыцадрэў» і нядаўнімі сусветнымі падзеямі, бамбардзіроўкай Сірыі, параўноўваючы знешнепалітычную сітуацыю з халоднай вайной.

«Калі я пра гэта даведаўся і пачуў, я проста вельмі шкадаваў, вельмі. Я больш глыбока гляджу на гэтыя праблемы. Але вырашаць унутрыпалітычныя пытанні за кошт знешняй такой агрэсіўнай палітыкі — гэта не той шлях. Сёння ўжо нават Амерыка ў адзіночку, і нават са сваімі найбліжэйшымі натаўскімі саюзнікамі свет не можа перавярнуць або кіраваць нават усім светам. Трэба абмяжоўваць свае апетыты і займацца тым, дзе твае інтарэсы. А яны — у Паўночнай Амерыцы перш за ўсё», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

На погляд беларускага лідара, Трампа падвяла эліта ЗША. «У іх не такая прэзідэнцкая ўлада, як, дапусцім, у Беларусі. Склалася сітуацыя, што яму трэба даказваць, што ён нешта можа, што можа кіраваць краінай. А там не даюць. Некаторыя прэзідэнты, каб вырашыць унутрыпалітычныя пытанні, спадабацца людзям, ціснуць на кнопкі».

Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што перш чым рабіць такія сур'ёзныя дзеянні, неабходна грунтоўна разабрацца ў сітуацыі. У прыклад Прэзідэнт прывёў знешнюю палітыку Кітая. Гэта магутная дзяржава, якая мае сучаснае ўзбраенне, не ўвязваецца ў міжнародныя канфлікты, — краіна працуе над развіццём сваёй эканомікі і сёння з'яўляецца сусветным лідарам па многіх пазіцыях.

Што датычыцца процістаяння Расіі і Амерыкі, Аляксандр Лукашэнка лічыць, што гэтыя дзве ядзерныя імперыі не дойдуць да адкрытага сутыкнення. «Я так думаю, ідзе інфармацыйная вайна. Адзін аднаго пужае, і нас імкнуцца запужаць. Ні Расія, ні Амерыка на «чырвоную кнопку» не націснуць, бо гэта будзе знішчэнне Амерыкі і Расіі, — столькі назапашана ядзернай зброі. А дзе гарантыя, што ў гэтую бойню не ўвяжуцца Вялікабрытанія, Францыя, Кітай, Індыя, Ізраіль, Пакістан, у якіх ёсць ядзерная зброя? Не думаю, што ўжо дойдзе да таго, што нехта возьмецца за ядзерную кнопку, але свет падышоў да вельмі небяспечнай рысы. Ніколі яшчэ гэтага не было»...

Пра адмену віз

Было пытанне і пра тое, ці разлічвае Беларусь на аналагічныя крокі з боку іншых краін на пяцідзённы бязвізавы рэжым. Прэзідэнт паведаміў, што гэта задача МЗС — пастаянна весці адпаведныя перамовы. У той жа час, Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што больш зацікаўлены ў тым, каб замежнікі прыязджалі да нас, прывозілі свае грошы, знаёміліся з Беларуссю.

Надзея ЮШКЕВІЧ,
yushkevich@zviazda.by

■ Парламенцкі дзённік

УЗАЕМНАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ

Працягваецца візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі на чале са спікерам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ у Ісламскую Рэспубліку Пакістан.

Учора адбыліся афіцыйныя перамовы Уладзіміра Андрэйчанкі з прэм'ер-міністрам Пакістана Навазам Шарыфам і прэзідэнтам Мамнунам Хусейнам па актуальных пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва, паведаміла прэс-служба ніжняй палаты.

Таксама Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся з міністрам планавання, развіцця і рэформаў Пакістана Ахсанам Ікбалам. Абодва бакі пацвердзілі зацікаўленасць у рэалізацыі сумесных праектаў у сферах прамысловасці, жыллёвага будаўніцтва, развіцця чалавечага патэнцыялу і сельскай гаспадаркі.

У гэты ж дзень беларуская делегацыя прыняла ўдзел у першым беларуска-пакістанскім сельскагаспадарчым форуме.

У рамках форуму адбылося падпісанне Мемарандума аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве паміж Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэтам і Аграрным універсітэтам Фэйсалабада, а таксама паміж прадпрыемствам «Гомсельмаш» і банкам «Зараі Тараківці Лімітэд».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ. *lukashevich@zviazda.by*

ДАБАВІЦЬ ЯШЧЭ МІЛЬЯРД

Учора ў ніжняй палаце беларускага парламента прымалі польскую дэлегацыю. Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, падчас візіту польска-беларускай парламенцкай групы на чале з яе старшынёй, дэпутатам Сейма Рэспублікі Польшча Адамам АНДРУШКЕВІЧАМ, заявіў аб тым, што да двух мільярдаў долараў мінулагодняга тавараабароту можна дадаць яшчэ адзін.

«У цэлым 2016-ы быў вельмі прадуктыўны, — адзначыў Баляслаў Пірштук. — Па выніках мінулага года, на мой погляд, мы няблага спрацавалі ў эканамічнай сферы. Наш узаемны тавараабарот наблізіўся да двух мільярдаў долараў. Гэта, вядома, добрая лічба. Але наш патэнцыял як з польскага, так і з беларускага боку значна вышэйшы».

Баляслаў Пірштук выказаў задавальненне стварэннем сумесных вытворчасцяў. На тэрыторыі Беларусі з удзелам польскага капіталу іх больш за 350, на польскай тэрыторыі беларускіх дзейнічае 18. «Гэта сведчыць пра нашы рэзервы. Але сальда пакуль не на нашу карысць», — сказаў парламентарый. На яго думку, беларускаму боку трэба больш актыўна працаваць, каб выраўняць гэты баланс, бо «гандлёва-эканамічныя адносіны добрыя, калі ёсць узаемная выгада».

У сваю чаргу Адам Андрушкевіч выказаў задавальненне тымі адносінамі, што склаліся паміж нашымі краінамі, і адзначыў тое, што яны хутка развіваюцца. Польскі парламентарый агучыў спадзяванне на візавыя паслабленні, нагадаў час, калі віз не было, калі супрацоўніцтва развівалася яшчэ больш актыўна. Бязвізавы 5-дзённы рэжым таксама станоўча адбіўся на адносінах нашых краін, падкрэсліў парламентарый.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Мэр Фрайберга выставіў Ангеле Меркель рахункі за размяшчэнне бежанцаў

Універсітэцкі горад Фрайберг (федэральная зямля Саксонія) на ўсходзе Германіі прыняў каля 1700 бежанцаў, утрыманне якіх летась абышлося мясцовым уладам у € 736 тысяч. Обер-бургамістр (мэр) горада Свен Кругер выставіў рахунак за прыём мігрантаў асабіста канцлеру Ангеле Меркель. Пра гэта паведаміла газета Die Welt.

На гарадскім сайце змешчана інфармацыя, што Фрайберг «адкрыты свету», што «многія гараджане аказваюць бежанцам самую розную дапамогу — ад ахвяраванняў рэчаў да шэфства ў пытанні навучання мове». Гэтая колькасць людзей — 1,7 тысячы саіскальнікаў прытулку — амаль 4% ад насельніцтва горада. Цяпер Кругер хоча атрымаць назад усе сродкі, затрачаныя з гарадской казны ў 2016 годзе на бежанцаў. Ён накіраваў рахунак напрамую на адрас ведамства федэральнага канцлера: асабіста канцлеру Ангеле Меркель, на вуліцу імя Вілі Бранта, 1, 10577, Берлін.

Тылерсан ляціць у Маскву на фоне спадзяванняў на нармалізацыю сувязяў, якія пахіснуліся

У цэнтральны пункт парадку дня маючых адбыцца перамоў новая адміністрацыя ЗША ператварыла сірыйскі крызіс, вылучыўшы пры гэтым патрабаванні да Масквы, якія з'яўляюцца заведама непрымальнымі. У сувязі з гэтым двухбаковыя адносіны фактычна завязаны на дыскусіі па Сірыі, а разбор завалаў назапашаных за апошнія гады праблем, які востра патрабуецца, можа апынуцца пад пагрозай.

Гэтак жа стала вядома, што дзяржсакратар Тылерсан абмяркуе ў Маскве, на якім этапе знаходзіцца зараз падрыхтоўка расійска-амерыканскай сустрэчы на вышэйшым узроўні.

На думку амерыканскай прэсы, «погляд дзяржсакратара Тылерсана заключаецца ў тым, што перш нам трэба падрыхтаваць глебу, убачыць, ці мае сэнс такая сустрэча» прэзідэнтаў Пуціна і Трампа «ў кантэксце двухбаковых адносін». Думаецца, у гэтым будзе заключацца падыход, які Тылерсан стане выкарыстоўваць, пішуць выданні.

У Аўстраліі заолагі вылечылі ад нарказалежнасці пітона, які жыў у прытоне

Двухметровы пітон, якога канфіскавалі супрацоўнікі паліцыі падчас рэйду ў лабараторыі па вытворчасці метамфетаміну, настолькі прыахвоціўся да наркотыкаў, што яго прыйшлося змясціць у спецыяльную рэабілітацыйную турму для... жывёл, паведамляе The Daily Telegraph.

Гіганцкая змяя прыцягнула ўвагу праваахоўнікаў сваімі агрэсіўнымі паводзінамі ў ходзе спецаперацыі. Як устанавілі пасля заолагі, рэптылія, знаходзячыся ў замкнёнай прасторы лабараторыі, падверглася ўздзеянню часціц метамфетаміну і фактычна стала залежнай ад наркотыку.

Як і ў выпадку лячэння нарказалежных людзей, змяю змясцілі ў спецыяльным рэабілітацыйным цэнтры для прадстаўнікоў дзікай прыроды ў Віндзары. На думку спецыялістаў цэнтра, якія прымалі змяю, нарказалежнасць пітона была бачная няўзброеным вокам. Спецыялістам рэабілітацыйнага цэнтра спатрэбілася каля месяца, каб вывесці наркотык з арганізма змеі, і толькі праз сем месяцаў рэптылія вярнулася да стану нармальнага жыцця.

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк» 19 апреля 2017 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ

Об утверждении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 10 апреля 2017 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут ознакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 11 апреля по 17 апреля 2017 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 17 апреля 2017 года по адресу: 220036, г.Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка и филиалов по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 10 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 10.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ХУТКІ ІНТЭРНЭТ — У ЛЮБЫМ КУТКУ КРАІНЫ

Да 2020 года 4G будзе ў кожным райцэнтры



На сёння 42 працэнты тэрыторыі Беларусі маюць сувязь па тэхналогіі 4G. «Далейшае развіццё будзе па неабходнасці. Будзе тэхналогія запатрабавана ў сельскіх населеных пунктах — пойдзем і туды», — запэўніў міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей ПАПКОЎ.

ТАРЫФЫ РАСЦІ НЕ БУДУЦЬ

Па звестках ведамства, стацыянарным шырокапалосным доступам у інтэрнэт карыстаюцца 70 працэнтаў хатніх гаспадарак. Пры гэтым за мінулы год сярэдняя хуткасць выросла з 5,7 да 8,8 Мбіт/с. Большае і колькасць абанентаў мабільнага інтэрнэту — цяпер іх 6,4 мільёна. За сем гадоў гэты паказчык павялічыўся ў сем разоў.

Генеральны дырэктар «Белтэлекама» Сяргей СІВАДЗЕДАЎ паведаміў, што да канца года цэны на паслугі доступу ў інтэрнэт застануцца нязменнымі.

— Чакаць павышэння не варта. Думаю, не толькі ў нас, але і ў мабільных аператараў. Сёння тарыфы на інтэрнэт акупныя. Разам з тым рэнтабельнасць гэтай паслугі пастаянна зніжаецца. Кліент сёння хоча мець хуткасць у разы вышэйшую за тую ж цану. А пашырэнне знешняга шлюзу — гэта затраты валюты. Таму перад аператарамі стаіць складаная задача — развіццё сваіх сетак без павелічэння тарыфаў на інтэрнэт, — растлумачыў Сяргей Сівадзедаў.

Вядзецца таксама работа над адменай роўмінгу ў СНД і ЕАЭС.

ID-ПАШПАРТЫ — З 2019 ГОДА

Кажучы аб планах развіцця галіны, Сяргей Папкоў агучыў, што да канца 2020 года доля ўстаноў адукацыі, ахопленых праектам «Электронная школа», мусіць скласці 80 працэнтаў. Усе ўрачы дзяржаўных арганізацый аховы здароўя павінны мець магчымасць выпісваць электронныя рэцэпты. Плануецца таксама, што доля адміністрацыйных працэдур для бізнесу, якія можна будзе здзяйсняць у электронным выглядзе, складзе не менш за 75 працэнтаў. А доступ да інтэрнэту будуць мець 80 працэнтаў хатніх гаспадарак. «Гэта мінімальныя лічбы, да якіх мы павінны імкнуцца. Але ўжо сёння некаторыя паказчыкі мы сур'ёзна перавысілі», — паведаміў міністр.

Развіваюцца нацыянальная сістэма беспапяровага гандлю, дзяржаўная сістэма пасведчання электронных ключоў (сёння ў краіне іх выдадзена каля 100 тысяч, патэнцыял — да 300 тысяч). Да канца наступнага года створаць партал адкрытых даных: будуць замешчаны базы найбольш значнай сацыяльнай інфармацыі, звязанай з бытавым абслугоўваннем, культурай, раскладам транспарту.

А ў 2019 годзе беларусы пачнуць атрымліваць біяметрычныя ID-пашпарты. Выглядаць яны будуць як звычайныя прапускныя карткі. З дапамогай такога пашпарта можна будзе аплачваць розныя электронныя паслугі.

Работа вядзецца ў рамках дзяржаўнай праграмы развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства на 2016—2020 гады. Кошт праграмы — каля 1,3 мільярда рублёў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

❍ У тэму

З 18 па 21 красавіка ў Мінску пройдзе XXIV Міжнародны спецыялізаваны форум па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «ТІБО-2017». Найноўшыя тэхналагічныя рашэнні прадставяць буйныя беларускія аператары: Белтэлекам, МТС, Velcom, Беларускія воблачныя тэхналогіі. Удзел прымуць таксама сусветныя кампаніі Huawei, ZTE, China Telecom, SAP, Deutsche Telekom і іншыя. На форуме прадэманструюць прымяненне тэхналагічных рашэнняў у самых розных сферах. Гэта «разумны дом», «разумны горад», сельская гаспадарка, банкаўскі сектар, прамысловасць, ахова здароўя, адукацыя, транспарт.

«ПАРАТРУПЕР» — БУДЗЕ СУПЕР?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тое, што машына пазначана ў спісе замены, не азначае таго, што яе трэба тут жа неадкладна паставіць на прыкол. Яна штогод праходзіць тэхнічную дыягностыку. Падчас яе эксперт шукае няспраўнасці, вызначае кампаненты атракцыёна, якія патрабуюць рамонту. І выносіць заключэнне: наколькі вялікі астаткавы рэсурс атракцыёна, і ці можа ён быць падоўжаны. І ўжо па выніках абследавання атракцыён можа быць дапушчаны да тэхнічнага агляду перад мяркуемым запускам.

Праблема зношанасці забаўляльных канструкцый існуе ў Беларусі ўжо не першы год. Яна разглядалася на нарадзе кіруючага складу Дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый і грамадзянскай абароны яшчэ ў 2011 годзе. У адпаведнасці з даручэннем прэм'ер-міністра выканаўчымі камітэтамі пры ўдзеле Мінскага гарадскога і абласных упраўленняў Дзяржпрамнагляду былі распрацаваны і зацверджаны графікі вываду з эксплуатацыі і замены атракцыёнаў, якія не адпавядаюць патрабаванням бяспекі.

Стоп, машына!

Летась інспектары Дзяржпрамнагляду выносілі такі вердыкт 13 разоў. Таксама яны зафіксавалі больш за трыста парушэнняў Правілаў па забеспячэнні прамысловай бяспекі атракцыёнаў. У асноўным яны датычацца арганізацыйных момантаў. Напрыклад, недастатковы нагляд за тэхнічным станам машын. Адказныя спецыялісты і персанал, які дапускаецца да работы з атракцыёнамі, часам прызначаюцца з парушэннем парадку. Асобным пунктам значацца тут атракцыёны перасоўныя — пасля кожнага пераезду яны мусяць праходзіць перааглядз, а ўсе патрэбныя дакументы разам з агрэгатам «даязджаюць» не заўжды.

У 2016 годзе на беларускіх атракцыёнах зарэгістраваны два няшчасныя выпадкі, прычым самі пацярпелыя груба парушылі тэхніку бяспекі. Абодва выпадкі адбыліся ў сталічным парку Чалюскінцаў. Летась у пачатку мая цяжкія траўмы атрымаў дзяжурны атракцыёнаў і гульнявога абсталявання. На падначаленым яму батутным комплексе не было наведвальнікаў, да таго ж пачаўся дождж. Супрацоўнік вырашыў схавацца ад яго ў аператарскай іншага атракцыёна. І выйшаў з кабіны падчас яго работы, дзе і трапіў адразу пад удар пасажырскага модуля. Агрэгат быў тэхнічна спраўны.

Больш за восем гадоў у краіне не здаралася няшчасных выпадкаў з лятальным зыходам — да мінулага жніўня, калі трагедыя адбылася на атракцыёне «Катальная гара». Адзін з наведвальнікаў паведаміў, што падчас катання згубіў навушнікі для тэлефона. Побач аказаўся работнік, чыя арганізацыя эксплуатавала іншы атракцыён. Ён вызваўся разам з дзяжурным агледзець магчымае месца, куды магла ўпасці гарнітура. Разам яны прайшлі за агароджу на тэрыторыю рабочай зоны. Прапажу так і не знайшлі. Работнік прапанаваў дзяжурнаму працягнуць работу атракцыёна. Аднак сам з рабочай зоны не выйшаў. Дзяжурны на гэта ўвагі не звярнуў і атракцыён запусціў. У выніку рухомы модуль на вялікай хуткасці забіў работніка.

Як праходзіць тэхнічны агляд атракцыёнаў перад іх запускам?

Ён складаецца з двух этапаў. Першы з іх заключаецца ў аналізе дакументацыі на атракцыён. Эксперт мусіць упэўніцца, як часта праводзіцца абслугоўванне агрэгата, наколькі якасна выконваюцца патрэбныя штодзённыя работы, ці правільна раскансервавалі машыну. Калі з пашпартам для атракцыёна ўсё ў парадку, то пачынаецца куды больш відовішчнае. Спярша атракцыён пракручваецца ўхаластую. Калі заўваг па рабоце ў гэтым рэжыме няма, тады грузяць на сядзенні атракцыёна мяшкі з пяском або манекены і запускаюць яго па новай. Праўда, пры выпрабаванні водных горак мяшкі з пяском і манекены ўжо не дапамогуць. Першыя маюць вагу, але не паўтараюць форму чалавечага цела, і наадварот. Таму эксперт літаральна сантыметр за сантыметрам абмацвае паверхню воднай горкі, а пасля па ёй праязджаюць некалькі добраахвотнікаў, якія маюць розную вагу.

Крыху іншы парадак вызначаны для перыядычнага тэхнічнага агляду перасоўных атракцыёнаў. Пасля першага мантажу яго праводзіць эксперт Дзяржпрамнагляду. Пасля кожнай новай установкі атракцыён таксама мусіць прайсці праверку. Праўда, гэтым разам праводзіць яе можа арганізацыя, якая мае адпаведны дазвол Дзяржпрамнагляду. А эксперт у такім выпадку мусіць быць атэставаны.

Да 2020 года па краіне неабходна было замяніць 117 атракцыёнаў. 41 з іх ужо адправіўся на заслужаны ў літаральным сэнсе слова адпачынак. Колькі з іх папоўняць гэты спіс сёлета, высветліцца пасля заканчэння праверак. Тэмпы абнаўлення парка ў Беларусі неаднародныя. Напрыклад, у Мінскай вобласці графік замены выконваецца цалкам. А вось на Гродзеншчыне і ў Мінску спісана толькі 80% маючых у гэтым патрэбу агрэгатаў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

■ Абітурыент-2017

Дадатковая льгота для пераможцаў алімпіяд

Міністэрства адукацыі зацвердзіла пералік міжнародных алімпіяд, пераможцы якіх змогуць сёлета без экзаменаў паступаць у ВНУ на найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці.

Нагадаем, што ў новых Правілах прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы для паспяховых «алімпіяднікаў» прадугледжваюцца дадатковыя магчымасці папоўніць шэрагі студэнтаў. Але ў чым іх сэнс, бо перамога на міжнароднай і рэспубліканскай алімпіядах у год паступлення аўтаматычна дае абітурыенту права на залічэнне без экзаменаў на адпаведныя спецыяльнасці ў ВНУ.

Згодна з зацверджанымі ў Правілах прыёму змяненнямі, **пераможцы міжнародных і рэспубліканскай алімпіяд па вучэбных прадметах (уладальнікі дыпломаў I, II і III ступеняў) змогуць паступаць без экзаменаў на найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці, дзе гэты прадмет вызначаны другім прадметам профільных выпрабаванняў.**

У прыватнасці, такое права будзе ў абітурыентаў, якія атрымалі дыпломы I, II, III ступені на 58-й Міжнароднай матэматычнай алімпіядзе (Бразілія), 51-й Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе школьнікаў па хіміі (Казахстан), 49-й Міжнароднай хімічнай алімпіядзе (Тайланд), 48-й Міжнароднай фізічнай алімпіядзе (Інданезія), 29-й Міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы (Іран), 28-й Міжнароднай біялагічнай алімпіядзе (Вялікабрытанія), 14-й Міжнароднай геаграфічнай алімпіядзе (Сербія), 6-й Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе для дзяўчат (Швейцарыя), 11-й Міжнароднай алімпіядзе па навуках аб Зямлі (Францыя), 13-й Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіядзе па фізіцы, матэматыцы і інфарматыцы (Казахстан), алімпіядзе школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства» (Расія).

Таксама без экзаменаў на найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці змогуць паступаць у ВНУ і абітурыенты, якія атрымалі дыпломы I, II, III ступені на трэцім (абласным ці Мінскім гарадскім) этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах. Пералік вучэбных прадметаў уключае беларускую мову і літаратуру, рускую мову і літаратуру, англійскую, нямецкую, французскую, кітайскую, іспанскую мовы, матэматыку, фізіку, астраномію, інфарматыку, біялогію, хімію, геаграфію, гісторыю Беларусі, сусветную гісторыю навейшага часу, грамадазнаўства і працоўнае навучанне.

Пералік вострадэфіцытных для эканомікі спецыяльнасцяў, дзе будуць рады бачыць абітурыентаў з добрай падрыхтоўкай, пакуль не агучаны. Ён павінен устанаўліваецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам эканомікі.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 15 мая 2017 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома в Беларучском сельском исполнительном комитете

Номер лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке зем. документации	Сумма задатка, бел. руб.
1	Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Мочаны, ул. Дачная, д. 2А, земельный участок, кадастровый номер 623280406101000426, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0, 1083	Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги	9 000,00	публикация в газете + 1 479,57	900,00
2	Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Корбачевка, земельный участок У-10, кадастровый номер 623280403601000072, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,1158	Возможность подключения к электроснабжению	6 000,00	публикация в газете + 1 527,22	600,00
3	Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Вяча, ул. Центральная, д. 8А, земельный участок, кадастровый номер 623280402101000184, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,1296	Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги	9 000,00	публикация в газете + 1 704,58	900,00

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет №3600619011127 в ЦБУ № 611 филиала № 500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 4901, УНН 600181549, получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.

Аукцион состоится 15 мая 2017 года в 10.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.

Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 08.00 до 13.00 с 14.00 до 17.00 по адресу: Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Последний день приема заявлений – 8 мая 2017 года до 17.00.

Контактные телефоны: (801774) 28636, 28495

БЕЛАРУСКІ КАРАЛЁЎ

Фота Надзеі БУЖАН.

Ва ўсіх тэхнічных памяшканнях наземнага комплексу кіравання працуюць сістэмы фільтравання паветра, вентыляцыі, падтрымання мікраклімату і пажаратушэння.

«КАЗАРМЫ» ДЛЯ ІНЖЫНЕРАЎ

— Гэты будынак — былая казарма, — паказвае на новенькі трохпавярховік **начальнік Цэнтра кіравання палётам спадарожніка Алег ВІНЯРСКІ**. — Ад яе пакінулі, па сутнасці, толькі нясучыя канструкцыі, усё астатняе перарабілі. Атрымалі 32 якасныя сучасныя кватэры, у іх жывуць многія супрацоўнікі ЦКП, у тым ліку і я. Увогуле, для работы цэнтра тут пабудавалі ўсю інфраструктуру. Мы маем уласную падстанцыю, якая сілкуецца ад дзвюх незалежных гарадскіх ліній. Нават калі раптам здарыцца такое, што абедзве крыніцы энергіі выйдуць са строю, у нас ёсць дзве аўтаматычныя дызель-генератарныя ўстаноўкі, якія спрацоўваюць праз 6—8 секунд адсутнасці сілкавання. Ёсць і ўласная кацельня, якая забяспечвае цёплай вадой асноўны будынак і інтэрнат, свая сістэма пажаратушэння ў кожным памяшканні, сваё кандыцыяніраванне, гаражы, склады... Прасцей кажучы, мы можам працаваць абсалютна аўтаномна нават у самых неспрыяльных умовах.

Навошта такія выдаткі? Усё проста: адна з галоўных характарыстык спадарожніка сувязі — надзейнасць. Заказчыкі, якія плацяць грошы за паслугі Белінтэрсат-1, павінны быць упэўненыя, што сігнал заўсёды стабільна дойдзе да спажыўца, незалежна ад знешніх фактараў. Акрамя таго, не сакрэт, што сатэліт іграе не апошнюю ролю ў сістэме ваеннай абароны краіны.

Асноўны будынак знаходзіцца за некалькі крокаў ад інтэрната. За ім — ідэальна роўная пляцоўка з газонам. Тут размяшчаецца цэлы комплекс з велізарных антэн, кожная з якіх мае сваё прызначэнне: 11-метровая для паслуг DTH, прасцей кажучы — спадарожнікавага тэлевяшчання, 13-метровая — для кантролю якасці сігналу ў С-дыяпазоне і кіравання самім сатэлітам, 9-метровая — для тых жа мэт у KU-дыяпазоне, яшчэ дзве меншага памеру — для перадачы даных, у тым ліку доступу ў інтэрнэт. Такім чынам, напрыклад, супрацоўнікі беларускіх пасольстваў за мяжой могуць заўсёды мець бяспечны доступ у сецівa без пасрэднікаў. Яшчэ ёсць функцыі IP-тэлефаніі і так званага стрымінгу, або прамой трансляцыі відэа ў інтэрнэт — апошнім разам яе выкарыстоўвалі для паказу чэмпіянатаў па таэквандо.

Пад кожнай антэнай знаходзіцца тэхнічнае памяшканне, дзе ўсталяваны сістэмы пажаратушэння і кантролю мікраклімату. Ёсць тут і ўласная метэастанцыя, бо надвор'е можа паўплываць на аказанне паслуг — пад уздзеяннем тэмпературы, ветру і вільгаці антэны скажаюць сігнал, гэта застаўляе павялічваць магутнасць перадатчыка. У Станькаве працуе і ўласная служба дэратызацыі ў асобе... рудога ката. Жарты жартамі, але мышы ўяўляюць сур'ёзную небяспеку для начыненага тысячамі правадоў будынка, таму дапамозе з боку вусатага ахоўніка тут толькі рады.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Х'ЮСТАН, У НАС НЯМА ПРАБЛЕМ!

Калі спадарожнік БДА мае ўласную арбіту і траекторыю руху, то Белінтэрсат-1 знаходзіцца на так званай геастацыянарнай арбіце — гэта значыць, ён амаль не рухаецца адносна зямной паверхні, бо яго хуткасць роўная хуткасці абарачэння планеты вакол восі. Спадарожнік знаходзіцца за 36 тысяч кіламетраў над экватарам прыкладна на 51,5 градуса ўсходняй даўгаты (гэта раён Індыйскага акіяна непадалёк ад берагоў Афрыкі), а таму можа перадаваць сігнал у любую кропку Усходняга паўшар'я. Тым



Аднаго манітора для работы аналітыка Валянціны ПАПІШЫ недастаткова.

не менш сатэліт патрабуе пастаяннага нагляду, бо на яго ўплывае гравітацыя самых розных аб'ектаў. Пяць сотых градуса — менавіта такі «люфт» дазволены для Белінтэрсат-1. У метрычнай сістэме гэта прыкладна 75 кіламетраў — не надта шмат у арбітальных маштабах.

Менавіта наглядам і маніпуляцыямі з «курсам» спадарожніка і займаецца цэнтр кіравання палётамі. Дастаткова вялікае памяшканне на першым паверсе асноўнага будынка, канешне, наўрад ці можа параўнацца з ЦКП у Каралёве і Х'юстане, але знешне ўсё нагадвае пра гэтыя знакавыя для касманаўтыкі месцы: велізарны гадзіннік з часам у розных паясах, шэрагі сталоў з безліччу камп'ютараў (дарэчы, дзе яшчэ ў Беларусі знойдзеш клавіятуру без кірыліцы, але з іерогліфамі), цэнтральны манітор з картай свету і, вядома, уважлівыя супрацоўнікі, якія сочаць за інфармацыяй на дысплэях.

— Мая работа заключаецца ў маніторынгу звестак са спадарожніка — так званай тэлеметрыі, — тлумачыць **інжынер аддзела аналізу і планавання Валянціна ПАПІША**. — Аналізуем яе за розныя перыяды, каб убачыць пэўны трэнд. Чатыры разы за змену праводжу праверку карыснай нагрузкі — ці ўсё працуе нармальна, ці не перавышаюць кліенты дазволены ўзровень магутнасці. Але самае цікавае — падрыхтоўка працэдур па кіраванні спадарожнікам. Якраз сёння будзе адна з іх — ідзе сезон зацьменняў, і Сонца ўздзейнічае на зямны датчык. Каб выключыць магчымасць памылак у замерах і пераходу апарата ў аварыйны рэжым, нам трэба будзе адключыць гэты індыкатар. Калі спадарожнік выходзіць з «бокса» — дазволенай траекторыі, праводзім манеўры для вяртання. Але здараецца гэта рэдка, у сярэднім раз на два тыдні.

Перад аналітыкам — адразу чатыры маніторы, бо часам прыходзіцца праглядаць дзясяткі графікаў і табліц. Работа, безумоўна, напружаная, тым больш, што адна змена тут цягнецца адразу 12 гадзін. Дзве начныя, дзве дзённыя змены, пасля чаго — чатыры выхадныя. Адначасова на змене ў ЦКП знаходзіцца ўсяго тры спецыялісты, менавіта на іх плячах ляжыць адказнасць за «выжывальнасць» спадарожніка. Усяго ж у наземным комплексе кіравання працуе 52 чалавекі.

— Апошняй інстанцыі, якая прымае канчатковыя рашэнні, тут не існуе, — кажа Алег Вінярскі. — Усё робіцца толькі калегіяльна, бо адзін чалавек заўсёды можа памыляцца. Вядома, ёсць яшчэ тэхпадтрымка вытворцы, куды заўсёды можа звярнуцца па кансультацыю — яны не зацікаўленыя ў страце апарата, бо для іх гэта таксама пытанне іміджу.

МІЛЬЁНЫ Ў РУКАХ МОЛАДЗІ

Першае, што кідаецца ў вочы ў наземным комплексе кіравання спадарожнікам, — сярэдні ўзрост супрацоўнікаў. Па словах Алега Вінярскага, гэта прыкладна 25 гадоў. Яшчэ да запуску Белінтэрсат-1 дэлегацыя з 25 чалавек адправілася на вучобу ў Кітайскую аэракасмічную акадэмію. Там з імі працавалі стваральнікі спадарожніка, якія вучылі беларусаў тонкасцям «касмічнай справы» на тэхніцы, блізкай па характарыстыках да будучага беларускага апарата. Таму ніякага мандражу падчас перадачы кіравання ў Станькава не было — досведу хапала ва ўсіх.

Што датычыцца новых супрацоўнікаў, то ў будынку ёсць усё для іх навучання. Напрыклад, сімулятар ЦКП — поўная копія памяшкання, пра якое ішла размова вышэй. Адзінае адрозненне — тут кіруюць не рэальным спадарожнікам, а віртуальным. На вуліцы ёсць такія ж «трэніровачныя» антэны, на якіх навічкі практыкуюцца ў настройцы, выхадзе на сувязь са спадарожнікам і іншых працэдурах.

— Мы адсочваем стан абсталявання на Белінтэрсат-1, падтрымліваем яго працаздольнасць, працуем з кліентамі, — кажа **начальнік аддзела маніторынгу і кіравання карыснай нагрузкай Цэнтра наземнага прымянення спадарожніка Юрый БАБРОЎ**. — У першую чаргу апарат арыентаваны на міжнародны рынак, таму шмат камунікуем з замежнікамі. Без праблем бяром на практыку студэнтаў, якраз цяпер стажыруецца моладзь з БДУ. Усё гэта інжынеры, якім трэба не толькі вырашаць рознага кшталту тэхнічныя праблемы, але і працаваць з кліентамі. Ніякіх праблем не ўзнікае, многія ездзяць на стажыроўкі ў замежжа, таму досведу маладой камандзе хапае.

Белінтэрсат-1 створаны на кітайскай платформе DFH-4, але гэта не значыць, што апарат — чужая распрацоўка.

— Мы не проста эксплуатуем чужую тэхніку, — тлумачыць начальнік ЦКП. — Супрацоўнікі прымалі ўдзел у стварэнні гэтага будынка разам з кітайцамі, манціравалі, падключалі і тэсціравалі абсталяванне, пракладвалі кабелі... Ездзілі на завод падчас зборкі спадарожніка, інспектавалі працэс вытворчасці, размаўлялі з канструктарамі, выказвалі свае прапановы. Таму і сам сатэліт, і наземны комплекс кіравання па поўным праве могуць лічыцца беларускімі.

Падчас арбітальных манеўраў на магутным рухавіку было выкарыстана 60 працэнтаў паліва — гэта неблагі паказчык, бо рухавікі малой цягі маюць значна меншы расход. Першапачаткова Белінтэрсат-1 быў разлічаны на 15 гадоў работы, але, па сцвярджэнні спецыялістаў ЦКП, яго можа хапіць і на большы тэрмін — усё дзякуючы эканомнаму і ашчаднаму падыходу падчас манеўраў.

— Калі першапачаткова спадарожнік быў у многім праектам прэстыжу, то цяпер мы разумеем, што гэта неблагі спосаб атрымання грошай, — кажа Алег Вінярскі. — Акрамя таго, калі ты паказваеш, што можаш апраўдаць такія вялікія ўкладанні, даражыш даверaным табе абсталяваннем, умееш ім правільна карыстацца, то ствараеш сабе пэўны імідж. Ужо цяпер мы працуем над пытаннем міжнароднага тэхнічнага супрацоўніцтва, маем шэраг падпісаных мемарандумаў з Ганконгам, Нігерыяй, Казахстанам. Мэта — расказаць пра свой досвед і пераняць замежны, бо грош цана тым ведам, якімі вы не гатовы дзяліцца. У будучыні ўвогуле плануем стварыць адзіную сістэму падрыхтоўкі кадраў, заснаваную на стажыроўцы ў замежных кампаніях. Мы хочам, каб кваліфікацыйныя патрабаванні былі паўсюды аднолькавымі, і мы маглі без праблем браць да сябе на стажыроўку спецыялістаў з замежжа і адпраўляць узамен сваіх. Такім чынам, мы будзем заўсёды забяспечаны якаснымі кадрамі, гэтак жа, як буйныя касмічныя дзяржавы, якія выдаткоўваюць на гэта шмат грошай.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Мінск — Дзяржынскі раён — Мінск.

ИЗВЕЩЕНИЕ

об открытых торгах в форме аукциона по предоставлению права на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, виноградной улитки (Helix pomatia) на территории Узденского района Минской области

Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, руб.	Сумма задатка, руб.
Право на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, виноградной улитки (Helix pomatia) на территории Узденского района Минской области	В соответствии с заключением, предоставленным Национальной академией наук Беларуси, промысловый запас виноградной улитки (Helix pomatia) составляет 2855,6 кг, предельно допустимый объем изъятия составляет 2141,7 кг	19 базовых величин – 437 рублей	20% – 87,4 рубля

Организатор открытых торгов в форме аукциона: Узденский районный исполнительный комитет, 223411, Минская область, г. Узда, ул. Советская, д. 22, 80171865437, сайты: uzda.minsk-region.by, minsk-region.gov.by.

ПРОДАВЕЦ: Узденский районный исполнительный комитет, 223411, Минская область, г. Узда, ул. Советская, д. 22, контактный телефон/факс 80171865437.

1. Открытые торги в форме аукциона состоятся 12 мая 2017 г. в 11.00 в здании Узденского районного исполнительного комитета по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, д. 22, каб. 418 (4-й этаж).

2. К участию в открытых торгах в форме аукциона допускаются юридические лица или индивидуальные предприниматели, подавшие в комиссию не позднее, чем за три рабочих дня до даты проведения аукциона соответствующее заявление, заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка, а также представляют копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя. При подаче документов заявитель (его представитель) представляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

В открытых торгах в форме аукциона могут принимать участие представители юридического лица и индивидуального предпринимателя при условии представления надлежаще оформленной доверенности.

3. Заявление на участие в открытых торгах в форме аукциона принимается в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, д. 22, каб. 110.

4. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в открытых торгах в форме аукциона на расчетный счет 3600631002512 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, МФО 153001795, УНП 600537220, код платежа 4005, затраты на проведение аукциона – сумму оплаты за опубликование в средстве массовой информации извещения о проводимом аукционе, получатель: Главное управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области.

5. Открытые торги в форме аукциона будут проводиться в соответствии с Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 года №699.

6. Организатор открытых торгов в форме аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, по не позднее, чем за 3 дня до назначенной даты его проведения.

7. Участник, ставший победителем открытых торгов в форме аукциона, после окончания аукциона обязан:

подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;

не позднее 10 рабочих дней со дня проведения открытых торгов в форме аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и внести плату за право на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, виноградной улитки (Helix pomatia) на территории Узденского района Минской области

■ Траекторыя поспеху

СПАДАРОЖНІК У ФАРМАЦЕ «НАНА»

Наземная інфраструктура, што была створана для забеспячэння дзейнасці першага беларускага касмічнага апарата, можа быць эфектыўна выкарыстана для кіравання эксплуатацыяй другога спадарожніка дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, работа над якім ужо пачалася. Пра гэта паведаміў дырэктар УП «Геаінфармацыйныя сістэмы» Сяргей ЗАЛАТЫ. Работы па стварэнні вядуцца сумесна з Расійскай Федэрацыяй, працэс праходзіць у штатным рэжыме, але пра вынікі гаварыць яшчэ рана.

— Яшчэ летась мы пачалі выконваць праект па развіцці наземнай інфраструктуры, — сказаў спецыяліст. — Дастаткова сказаць, што прыёмная станцыя, якая была створана яшчэ 12 гадоў таму, прайшла працэдуру падаўжэння тэрміну эксплуатацыі і цяпер можа выкарыстоўвацца яшчэ 10 гадоў. Для гэтага была праведзена замена электронікі і механічных вузлоў, якія адпрацавалі свой рэсурс. Усе работы на сённяшні дзень завершаны.

Акрамя таго, па словах Сяргея Залатога, сёлета Беларусь плануе запусціць універсітэцкі нанаспадарожнік, распрацаваны ў БДУ. Такі апарат па тэхнічных характарыстыках падобны да сваіх «вялікіх пабрацімаў», але мае невялікія памер (20х20х10 см) і вагу (усяго 2 кг). Адпаведна, непараўнальна ніжэйшы і кошт спадарожніка. У БДУ створаны цэнтр кіравання і станцыя прыёму, працаваць тэхніка будзе ў аматарскім радыёдыяпазоне.

— Наша задача цяпер — не толькі стварацъ спадарожнікі, але і распрацоўваць механізмы па прымяненні гэтых тэхналогій у разнастайных адгалінаваннях, — падкрэсліў **кіраўнік апарата Нацыянальнай акадэміі навук, акадэмік Пётр ВІЦЯЗЬ**. — Мы кааперуемся з міністэрствамі і ведамствамі краіны, узаемадзейнічаем з 20 айчыннымі і 40 расійскімі прадпрыемствамі. Мікраэлектроніка, інфармацыйныя тэхналогіі, новыя матэрыялы — гэта тыя кірункі, які развіваюцца дзякуючы дасягненням у касмічнай сферы. Акрамя таго, нам разам з Міністэрствам адукацыі трэба развіваць сістэму падрыхтоўкі кадраў для гэтага адгалінавання, у тым ліку і пры дапамозе нанаспадарожнікаў

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

12 красавіка 2017 г.
№ 12 (396)

стар. 3

Прыватную ініцыятыву неабходна разняволіць

стар. 5

Моладзь з Лёзна навучаецца парламентарызму

стар. 7

Самакіраванне пачынаецца... з уласнага пад'езда

ЁСЦЬ ПРАПАНОВА!

ХУТАР ПАД ЗНОС

Фота Анатоля КІПІШЧУКА.

Як пазбавіцца ад старых будынкаў? Улады Воранаўскага раёна лічаць, што патрэбна абласная праграма з удзелам меліяратараў.

ТРУХЛЯВЫХ дамоў, якія стаяць у запусценні, з кожным годам становіцца больш, канстатуе **старшыня Воранаўскага раённага Савета дэпутатаў Віктар РОІК**. Праблема іх зносу хоць і вырашаецца, але вельмі марудна. З аднаго боку, узнікаюць цяжкасці з пошукам гаспадароў і судовымі працэдурамі, з другога — сам працэс зносу не танны.

— Мы праводзім работу згодна з рэкамендацыямі абласнога Савета дэпутатаў, ёсць пакрокавы план, як весці юрыдычныя працэдуры, — тлумачыць Віктар Роік. — Мы на месцы распрацавалі свой алгарытм дзеянняў, бо ў нас спецыфічны раён — вельмі многа хутароў, яшчэ нядаўна было больш за тысячу.

Зараз гэта лічба крыху зменшылася, і сёння іх 850! Прыкладна палова стаяць пустымі. Іх трэба зносіць.

— Раней людзі ахвотна бралі зямлю, будаваліся там. Вялі гаспадарку. Цяпер час змяніўся, хутары пазарасталі травой, многія нашчадкі з'ехалі, нават у правы спадчыны не ўступілі, бо не бачаць перспектывы ў гэтым, — кажа старшыня райсавета.

І задаецца пытаннем: як такіх гаспадароў прымусіць парадак навесці? Тым не менш для зносу трэба атрымаць згоду ўладальнікаў жылля. А многія з іх жывуць у суседняй Літве. З'ехалі, калі яшчэ межаў не было, і цяпер адшукаць іх там няпроста. Але і тыя развалюхі, якія перайшлі па рашэнні суда ва ўласнасць сельскіх Саветаў, не так лёгка разабраць, а тым больш — прадаць. Таму ў раёне заахвочваюць мясцовыя СПК, якім пераходзіць зямля пад севазварот. Яны і бяруць на сябе выдаткі па зносе старых хутароў. У выніку і парадак вакол, і зямля дае аддачу.

— Мы сабе нават задачу паставілі — 3—5 пустых дамоў штогод будзе разбірацца. А гэта да 70 сотак зямлі, а то і гектар — выгадна, таму кіраўнікі гаспадарак ідуць на гэта, — удакладняе Віктар Роік.

Акрамя хутароў, трэба зносіць трухлявыя дамы ў вёсках. Там пакінутых развалюх больш за палову. А ў адзінаццаці населеных пунктах і наогул ніхто не жыве. Да разбору такіх дамоў і прыбудоў прыцягваюць мясцовых жыхароў. Зараз на чарзе вёска Мніхі (у Жырмунскім сельсавеце), дзе пражывае адзін чалавек.

— Аб'ёмы з кожным годам растуць, таму гэту справу трэба весці арганізавана, — лічыць Віктар Роік. — Абавязкова задзейнічаць камунальнікаў, якія на месцы перапрацуюць зараснікі каля дамоў у дранку. Падлічылі, што затраты акупяцца — і на паліва, і на падаткі.

стар. 4

ЗАБАЎЛЯЛЬНАЯ ПРАГРАМА

КУЛЬТУРА З «ІСКРЫНКАЙ»

Ці можа сельскі Дом культуры супрацьстаяць гарадскім спакусам і як схіліць наведвальнікаў да мясцовага культурнага адпачынку? Адказы на пытанні мы шукалі ў Вярэйках Ваўкавыскага раёна.

ПАД АДНЫМ ДАХАМ

Акуратны, нядаўна адрамантаваны будынак кожнаму сустрэчнаму даводзіць, што «мастацтва належыць народу», праз надпіс над дзвярамі. Лозунг застаўся яшчэ з 1968 года, калі ў вёсцы з'явілася ўстанова культуры. Прыблізна ў той жа час тут будаваліся і іншыя аб'екты, вось толькі сёння некаторыя з іх напаўпустыя — будаўніцтва ішло з размахам і запасам, але цяпер колькасць жыхароў аграгарадка вагаецца на ўзроўні тысячы чалавек. Тым незвычайней, што ў Доме культуры няма запусцелых пакояў.

— Гуртаваць культуру пад адным дахам характэрна для сельскай мясцовасці, — кажа **старшыня Вярэйкаўскага сельскага Савета Анатоль СТАСЮКЕВІЧ**. — Звычайна блізкімі сферамі дзейнасці займаюцца адны і тыя ж работнікі, а разносіць па асобных будынках тую ж дыскатэку і кіназалу — навошта? Так зручна для наведвальнікаў, а кіраўніцтва эканоміць сродкі і памяшканні.

Сапраўды, Дом культуры ў Вярэйках нагадвае бабулін куфэрак. Пад адным дахам, акрамя згаданай танцавальнай пляцоўкі і кіназалы з магчымасцю дэманстрацыі фільмаў у 3D (пры неабходнасці зала ператвараецца ў канцэртную), знаходзяцца памяшканні для гурткоў, бібліятэка, зала для заключэння шлюбу. Дарэчы, ў Ваўкавыску пакуль толькі плануецца пабудова загса, так што маладыя пары Вярэйкаўскага сельсавета ў гэтым плане нават наперадзе райцэнтра.

Задзейнічана і прастора побач. Летам на пляцоўцы за клубам усталёўваюцца парасоны летняй кавярні, адгароджваецца ўчастак з газонам і дзіцячымі атракцыёнамі. Крыху далей, на беразе возера, — вулічная сцэна для масавых канцэртаў.

ДЗЕ ШУКАЦЬ ГЛЕДАЧА

Пенсійнага ўзросту дасягнула прыкладна трэцяя частка жыхароў сельсавета. Моладзь у асноўным працуе ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Ваўкавыскае», таксама вялікая доля занятая ў сферы адукацыі і медыцыны.

стар. 6

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вярэйкаўскі Дом культуры пабудаваны пяцьдзясят гадоў таму, але тагачасны лозунг на яго фасадзе актуальны і сёння.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Стварыць стварылі, а ўкараняць?

Спікер верхняй палаты ўзяў удзел у нарадзе па развіцці навукі

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, узяў удзел у нарадзе аб праблемах і перспектывах развіцця беларускай навукі, што праводзіў на мінулым тыдні кіраўнік дзяржавы.

Цяпер у нашай краіне шукаюць аптымальны варыянт дзяржзакупак навукова-даследчых распрацовак, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў падчас мерапрыемства. У Беларусі рыхтуецца праект адпаведнага нарматыўнага прававога акта. Ён будзе датычыцца прадукцыі, атрыманай у выніку навукова-даследчых і даследна-канструктарскіх работ, інвестыцыйных праектаў. Менавіта праблему з яе ўкараненнем у вытворчасць закрануў на нарадзе старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч.

Сябруем парламентамі

У верхняй палаце абмеркавалі супрацоўніцтва з Дзяржавай Ізраіль

У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча спікера верхняй палаты беларускага парламента Міхаіла Мясніковіча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Дзяржавы Ізраіль у нашай краіне Алонам Шогамам.

Бакі абмеркавалі развіццё беларуска-ізраільскага міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай і іншых сферах, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Па выніках гутаркі выказана ўзаемная зацікаўленасць у далейшым пашырэнні ўзаемавыгадных сувязяў, у тым ліку па лініі парламентаў дзвюх краін. У сустрэчы таксама прыняў удзел старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Дзяржавы Ізраіль Аляксандр Папкоў.

Таксі, прадпрымальніцтва і ЕАЭС

Праблемныя пытанні дарожнай сферы абмеркавалі ў Савеце Рэспублікі

Пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова прайшла нарада па абмеркаванні законапраекта «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтамабільным транспарце і аўтамабільных перавозках», які плануецца разгледзець у ходзе другой сесіі Савета Рэспублікі шостага склікання.

Удзельнікі нарады абмеркавалі палажэнні законапраекта, якія датычацца павышэння эфектыўнасці функцыянавання рынку перавозак пасажыраў аўтамабілямі-таксі, стварэння ўмоў для развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы і дзяржаўна-прыватнага партнёрства, а таксама для далейшай інтэграцыі аўтатранспартнай сістэмы Рэспублікі Беларусь у аўтатранспартныя сістэмы Еўразійскага эканамічнага саюза і Еўрапейскага саюза. Акрамя таго, выпрацаваны канкрэтныя меры па вырашэнні праблемных пытанняў пры ажыццяўленні міжнародных аўтамабільных перавозак.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

ДАПАМОГА

Калі кожнае дрэва — на вагу золата

Савет Рэспублікі працуе не толькі «ў кабінетах», але і на зямлі

У апошні дзень добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу — 2017» кіраўніцтва Савета Рэспублікі і работнікі Сакратарыята адправіліся ў Мінскую вобласць — у Бараўлянскі спецлясгас. Каля 40 чалавек на працягу некалькіх гадзін высаджвалі дрэвы, каб аднавіць пацярпелую тэрыторыю.

Участак непадалёк ад вёскі Прылессе быў пашкоджаны ўраганам 13 ліпеня 2016 года. Тут была праведзена высечка, а атрыманую пасля яе драўніну рэалізавалі на ўнутраным рынку. «Каб зямля не пуставала, мы аднаўляем лясныя культуры, — адзначае **дырэктар Бараўлянскага спецлясгаса Аляксандр МІРАНОВІЧ**. — Пасадачны матэрыял — гэта двухгадовая хвоя з палепшанымі генетычнымі якасцямі». Сіламі ўдзельнікаў акцыі была адноўлена тэрыторыя ў памеры 3,6 гектара, пры гэтым на кожным з іх пасаджана больш за 5 тысяч маладых дрэў.

«Дапамога людзей — каласальны ўклад у нашу працу, паколькі самастойна лясгасам вельмі складана аднавіць такія плошчы», — падкрэслівае Аляксандр Мірановіч. Па словах дырэктара спецлясгаса, акрамя арганізацый, дапамогу прапаноўваюць і звычайныя людзі. «Сямейныя пары з дзецьмі прыязджалі, каб паўдзельнічаць. Ды і цяпер на многіх участках прысутнічаюць добраахвотнікі, мясцовыя жыхары, якія проста хочуць дапамагчы».

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ ужо пяты год запар выязджае на пасадку дрэў. «Я і іншыя ўдзельнікі прыехалі, каб зрабіць свой маленькі ўнёсак у такую вялікую справу. Бо лес — гэта наша здароўе. У многіх краінах, напрыклад у Фінляндыі і Японіі, лесам лечаць: раяць у ім прагульвацца, дыхаць свежым паветрам, — заўважыў Уладзімір Панцюхоў. — Цяжка сказаць, колькі я пасадзіў дрэў за гэтыя гады. Безумоўна, набярэцца некалькі сотняў».

— Мы ўжо традыцыйна выязджаем і ўдзельнічаем у гэтай акцыі, — адзначыў **начальнік Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр СЛАБАДЧУК**. — З'яўляецца магчымасць адчуць свой уклад у агульную справу — захаванне прыроды. Бо для нас кожнае дрэва — на вагу золата. Кожны будзе памятаць, што на гэтым кавалачку зямлі, на гэтым месцы ён пасадзіў дрэва. І гэта гісторыя, якую можна перадаць дзецям, унукам і якой сапраўды можна ганарыцца.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ. *lukashevich@zviazda.by*

МЕРКАВАННЕ

У ДАПАМОГУ ІНТЭГРАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСАМ

Што могуць зрабіць заканатворцы?

У адзіночку ў сучасным глабалізаваным свеце не выстаіш. Таму, каб больш паспяхова развівацца, краіны мусяць інтэгравацца з іншымі, суадносячы ўласныя эканамічныя, заканадаўчыя працэсы з краінамі-партнёрамі. Для Беларусі, сярод іншых аб'яднанняў, ключавымі выступаюць Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, а таксама Еўразійскі эканамічны саюз. Але і тут не абыходзіцца без хібаў рознага плану, у тым ліку заканадаўчых. Якім чынам іх варта ліквідаваць?

Ала БОДАК, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:

— Падчас адкрыцця другой сесіі Савета Рэспублікі, акрамя асноўных задач, якія і без таго закладзены ў плане работы камісіі, Міхаіл Мясніковіч агучыў тыя, на якія варта скіраваць увагу. Адна з іх — уніфікацыя і гарманізацыя ў межах Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і Еўразійскага эканамічнага саюза.

Задача ўсіх структур Саюзнай дзяржавы і асабліва яе Парламенцкага сходу — гэта збліжэнне нацыянальных заканадаўстваў у мэтах стварэння роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання і ўраўнаважанне правоў грамадзян Беларусі і Расіі. Сэнс уніфікацыі і гарманізацыі заключаецца ў тым, каб нацыянальныя заканадаўствы мелі максімальна падобныя падыходы да прававога рэгулявання. У нашых суб'ектаў гаспадарання яшчэ з савецкіх часоў засталіся эканамічныя, асабістыя сувязі. Для таго каб ім было прасцей працаваць на сумесным рынку, трэба пастаянна збліжаць заканадаўчую базу. Гэта датычыцца і прызнання адукацыйных дакументаў, у тым ліку ў сферы вышэйшай адукацыі і навуковай сферы, і рэалізацыі права на ахову здароўя. Я з'яўляюся намеснікам старшыні Камісіі па заканадаўстве і рэгламенце Саюза Беларусі і Расіі, і для нас важна выпрацаваць такі механізм, які б стаў універсальным для любой сферы і эфектыўна працаваў.

Што датычыцца Еўразійскага эканамічнага саюза, то тут гаворка ідзе ўжо пра пяць удзельнікаў аб'яднання. У ім няма парламенцкага вымярэння, але ёсць хібы ў заканадаўстве, якія яшчэ належыць выправіць. Сумесна з Саветам Міністраў, які адказвае за дадзены кірунак, мы будзем садзейнічаць гэтай рабоце.

Трэба зазначыць, што такая праца праводзіцца не з чыстага ліста, а вядзецца нашай камісіяй даўно.

Таксама адным з важных для нас кірункаў з'яўляецца садзейнічанне стварэнню больш камфортных умоў для вядзення бізнесу. Адзін з членаў Савета Рэспублікі бярэ ўдзел у рабочай групе па пытаннях удасканалення кантрольнай дзейнасці і выключэння залішніх патрабаванняў да бізнесу, якая створана распараджэннем Прэзідэнта. З нашым удзелам ён прадставіў пісьмовыя прапановы, якія ўжо былі ўнесены ў частцы ўдасканалення інвестыцыйнай дзейнасці, занятасці насельніцтва, аптымізацыі юрыдычнай адказнасці ў сферы бізнесу. Гэта аптымізацыя мер адказнасці за шэраг эканамічных злачынстваў, увядзенне адміністрацыйнай прэюдыцыі ў дачыненні да тых учынкаў, якія сёння з'яўляюцца эканамічнымі злачынствамі, перавод іх у разрад адміністрацыйных правапарушэнняў. Мы прапануем прыдаць новы характар норме Крымінальнага кодэкса, якая кажа пра тое, што эканамічна абгрунтаваная рызыка з'яўляецца падставай для вызвалення ад крымінальнай адказнасці. Норма павінна рэальна працаваць. Меры юрыдычнай, крымінальнай, адміністрацыйнай адказнасці варта паляпшаць нараўне з мерамі па лібералізацыі парадку вядзення бізнесу. Гэта трэба рабіць адначасова.

Рыгор БЫСЮК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:

— Задачай камісіі з'яўляецца далейшае развіццё міжнароднага супрацоўніцтва, у тым ліку з краінамі дальняй дугі, такімі як, напрыклад, Кітай, Іран і іншыя. На нядаўнім пасяджэнні камісіі мы абмяркоўвалі перспектыву бязвізавага рэжыму з Аргенцінай. У нас ужо створана дэпутацкая група па падрыхтоўцы гэтага пытання, чакаецца, што аргенцінскія калегі ў хуткім часе таксама сфарміруюць групу з членаў парламента і пачнецца прадметны абмен інфармацыяй. Таксама на парадку дня застаецца выпрацоўка дакументаў па ўдакладненні дзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюза.

Алег РУМО, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:

— Мы вельмі спадзяёмся, што Еўразійскі эканамічны саюз нарэшце пачне прыносіць карысць нашай краіне, што ўсе дамоўленасці, якія былі дасягнуты, будуць рэалізаваны. Мы пазбавімся ад абмежаванняў і будзем сапраўды на роўных гандляваць з нашымі партнёрамі. Акрамя таго, мы спадзяёмся, што кантакты ў гуманітарнай сферы яшчэ больш умацуюцца і разаўюцца, таму што гэта таксама вельмі важны складальнік любога міжнароднага супрацоўніцтва. Я маю на ўвазе ўсё: ад культуры, навукі, аховы здароўя, адукацыі і да асабістых, чыста чалавечых кантактаў. Менавіта таму дапрацоўкі патрабуе заканадаўчая база ЕАЭС, над чым мы і будзем працаваць.

Ніна ЖАЛЯЗНОВА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— У членаў камісіі ёсць свае вытворчыя аб'екты і сферы дзейнасці, і кожны будзе працаваць у сваёй сферы ў рамках інвестыцый. Я, як кіраўнік сельскагаспадарчага прадпрыемства, вывучаю гэта пытанне ў сваім кірунку. Трэба думаць, якія павінны прыйсці інвестыцыі, каб правільна выкарыстоўваць пэўны рэсурс. Да патэнцыйнага інвестара трэба ставіцца вельмі ўважліва: адна справа, калі ён проста набывае абсталяванне, але іншая — калі навязвае сваю тэхналогію. Ці заўсёды яна адпавядае таму, што хочам мы для сваёй зямлі? Таму мы вельмі ўважліва прапрацуем менавіта аспект інвестыцый.

Інвестара — актывізаваць, ініцыятыву — разняволіць

Дэпутат расказаў аб рабоце над папраўкамі да некаторых законаў

Самае галоўнае пытанне, якое стаіць на парадку дня, — далейшае паступальнае развіццё эканомікі. Пойдзе ўверх эканоміка краіны — з'явіцца больш рабочых месцаў, стане меншым градус сацыяльнай напружанасці. Паспрыяць пераліченаму, паскорыць гэты працэс павінны шэраг законапраектаў, якія абмяркоўваюцца цяпер у парламенце. Аб гэтым і не толькі мы гаворым з намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў ад Брэсцкай-Заходняй выбарчай акругі №1 Леанідам БРЫЧОМ.

— У краіне ёсць праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2020 года. Яе рэалізацыя ў многім залежыць ад заканадаўчай базы, — кажа Леанід Брыч. — Цяпер наша камісія працуе над удасканаленнем законаў аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, прыватызацыі, інвестыцыях, банкруцтве, гаспадарчых таварыствах і дзяржзакупках. Усе яны накіраваныя на стымуляванне беларускай эканомікі, на разняволенне дзелавой ініцыятывы, адным словам, на развіццё. Настаў час прыняць цэлы комплекс мер для карэннага паляпшэння ў сферы бізнесу. Гэта датычыцца і кантрольна-рэвізійнай дзейнасці, і магчымасці інвестыцый у сферу будаўніцтва і многага іншага.

> Ідэі бываюць даволі смелыя. Магчыма, некаторыя з іх з часам знойдуць сваё ўвасабленне, хоць пакуль гэта выражаецца на ўзроўні дыскусій.

Скажам, закон аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве быў прыняты ў 2015 годзе. Цяпер ён дапрацоўваецца. Гэта надзвычай актуальны закон. З аднаго боку, ім прадугледжаны гарантыі і абавязацельствы дзяржавы, а з другога... пэўная смеласць інвестара. Апошні, як чакаецца, укладзе свае сродкі на перыяд 10—15 гадоў, ці нават 20—25 гадоў у развіццё той ці іншай галіны эканомікі краіны.

Пілотны праект, які рэалізуецца дзякуючы гэтаму закону, — будаўніцтва ўчастка дарогі М10 (Кобрын — Гомель). Інвестарам выступіў Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця. Але падчас яго рэалізацыі ўзніклі пытанні, якія запатрабавалі ўнесці папраўкі ў закон. Заканадаўчы акт будзе дапрацаваны. І мы спадзяёмся, што прыклад з названага банка возьмуць іншыя інвестары. Пляцоўкі для ўкладвання інвестыцый вызначаны. Сярод іх можна назваць будаўніцтва анкалагічнага дыспансера ў Гродне, узвядзенне дзіцячых садкоў у Мінскай вобласці і станцыі хуткай дапамогі ў Баранавічах. Кожны з абласных выканаўчых камітэтаў мае ў планах падобны праект.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

— Тое, пра што вы расказалі, няхай і на пачатковай стадыі, але набывае рэальныя абрысы. Хацелася б даведацца пра новыя, хай сабе рэвалюцыйныя, ідэі, што разглядаюцца ці абмяркоўваюцца ў вашай камісіі.

— Ідэі бываюць даволі смелыя. Магчыма, некаторыя з іх з часам знойдуць сваё ўвасабленне, хоць пакуль гэта выражаецца на ўзроўні дыскусій. Так было, напрыклад, падчас сумеснай нарады нашай камісіі з кіраўніцтвам Міністэрства эканомікі. Мы абмяркоўвалі магчымасць легалізацыі капіталаў, якія захоўваюцца ў нашых суайчыннікаў. Ніхто дакладна не ведае, але, супаставіўшы розныя крыніцы інфармацыі, можна меркаваць аб існаванні прыблізна 5—7 мільярдаў долараў, якія, вобразна кажучы, «захраслі» ў панчохах альбо «закатаныя» ў слоіках. Калі б неўзабаве паявіўся заканадаўчы акт, які гарантаваў бы недатыкальнасць гэтых сродкаў, людзі змаглі б укласці частку грошай у агульнакарысную справу.

Сёння прапануецца прапісаць і такую норму, у адпаведнасці з якой пры будаўніцтве жылля падатковыя органы не будуць патрабаваць дэкларацыю альбо пытацца, адкуль гаспадар узяў грошы на ўзвядзенне дома. Пакуль, праўда, гэты дакумент існуе як праект, але ёсць спадзяванне, што сёлета ён будзе зацверджаны. І гэта першы крок да той самай легалізацыі. Крок, прадыктаваны падзеямі апошніх гадоў. Менавіта рынкавая арыентацыя эканомікі выклікала пагалоўную аптымізацыю. За тры-чатыры гады ў адной толькі Брэсцкай вобласці было скарочана амаль 50 тысяч чалавек. Вядома, частка з іх уладкавалася на іншыя прадпрыемствы, у тым ліку новыя, напрыклад у СЭЗ. Але частка пайшла па шляху самазанятасці. Нехта здолеў зарабіць сродкі на будоўлях суседніх краін, іншыя кармілі сям'ю паездкамі ў Польшчу: гарэлка, цыгарэты, дызельнае паліва... Для таго каб ажывіць эканоміку, трэба пралічваць усе шляхі, задзейнічаць усе магчымасці.

— Якія папраўкі чакаюць закон аб прыватызацыі і як гэта можа паўплываць на стымуляванне эканомікі?

— Самая грунтоўная папраўка, якая чакае названы закон, датычыцца змянення тэрміну іскавай даўнасці з моманту прыватызацыі. Цяпер тэрмін даўнасці складае 10 гадоў. Гэта значыць, што пры вызначаных абставінах здзелка можа быць ануляваная і праз дзесяцігоддзе. Прапаноўваем скараціць названы тэрмін да 3 гадоў. Чаму? Эксперты кіраваліся найперш сусветным вопытам, такі адрэзак практыкуюць большасць дзяржаў. А, напрыклад, у Расіі прапаноўваюць скараціць тэрмін іскавай даўнасці наогул да аднаго года. Рабочая група хутка збярэцца і будзем усебакова абмяркоўваць і разглядаць усе прапановы.

Змяненне, якое мы прапануем, накіравана перш за ўсё на лібералізацыю адносін у эканоміцы. Мы спадзяёмся, што такая мера дазволіць актывізаваць інвестара.

— Цяпер многа і справядліва гаворыцца пра паляпшэнне бізнес-клімату, пра разняволенне прыватнай ініцыятывы... Але як, па-вашаму, пераадолець супраціўленне на месцах, якое ідзе ад боязі быць пакараным за ініцыятыву? У нашай газеце не так даўно быў надрукаваны матэрыял пра хаджэнне па пакутах прадпрымальніцы з вёскі Кобрынскага раёна. Яна не можа набыць памяшканне, якое пустуе 16 гадоў! Ёй выстаўляюць нерэальны кошт. І такіх прыкладаў колькі хочаш. Службовыя асобы баяцца, што іх абвінавацяць у карупцыі, і кіруюцца прынцыпам: лепей перасядзець. За гэта ж не пакараюць. А калі аддасі танна той жа пусты, нікому не патрэбны будынак, могуць прыйсці і спытаць.

— Пра гэта зараз актыўна загаварылі, у тым ліку і ў нас у парламенце. Рыхтуецца дакумент па ўпарадкаванні кантрольна-рэвізійнай дзейнасці, які прадугледжвае і права рызыкі для кіраўніка. Згодны з вамі, кіраўнік цяпер сядзіць і думае: не буду рабіць рэзкіх рухаў, каб не прыцягнуць да сябе лішнюю ўвагу. Нядаўна мой калега, дэпутат аднаго з сельскіх раёнаў, абурана расказваў пра зварот да яго мясцовага фермера. Сельскі гаспадар просіць парадаць яму некалькі гектараў закінутай зямлі і не можа нічога дабіцца. У райвыканкаме не бяруць на сябе адказнасць прыняць адпаведнае рашэнне. Здавалася б, калі ты баішся на месцы паставіць выніковы подпіс, звярніся ў аблвыканкам, заручыся падтрымкай, але зрабі на карысць справы. У любым выпадку пустуючыя будынкі, зямля, прыцягнутая ў гаспадарчы абарот, паслужаць не толькі асобнаму прадпрымальніку, яны пацягнуць за сабой стварэнне новых рабочых месцаў, павелічэнне падаткаў, паляпшэнне эканамічнай сітуацыі, хай сабе на мікраўзроўні. Але ж прагрэс краіны немагчымы без прагрэсу аднаго ўмоўнага прадпрыемства нават з самай малой вёсачкі. Таму, вядома, патрэбны нейкі дакумент заканадаўчага характару і з гэтай нагоды. Я думаю, дэпутаты прымуць самы актыўны ўдзел у яго распрацоўцы.

> Супаставіўшы розныя крыніцы інфармацыі, можна меркаваць аб існаванні прыблізна 5—7 мільярдаў долараў, якія, вобразна кажучы, «захраслі» ў панчохах альбо «закатаныя» ў слоіках.

— У вас, Леанід Рыгоравіч, толькі што скончыўся прыём грамадзян. Не магу не спытаць: з якімі праблемамі і пытаннямі ідуць людзі да дэпутата?

— За час работы ў якасці дэпутата я правёў пяць прыёмаў выбаршчыкаў. Кожны раз прыходзіць ад пяці да дзесяці чалавек. У асноўным людзі звяртаюцца па пытаннях, звязаных з добраўпарадкаваннем і камунальнымі праблемамі, часам просяць паспрыяць з працаўладкаваннем. Двое грамадзян прынеслі свае прапановы па змяненні законаў. Адзін мае праект па ўдасканаленні артыкула Жыллёвага кодэкса, другі лічыць патрэбным унесці змены ў закон аб жывёлах. У абодвух выпадках яны сутыкнуліся з праблемамі на асабістым прыкладзе і прыйшлі да высновы, што іх досвед можа стаць падставай для ўдасканалення законаў. Мяне як дэпутата такі падыход радуе.

А літаральна нядаўна звярнулася пенсіянерка з брэсцкага мікрараёна Бярозаўка, якая не можа дабіцца справядлівасці. Яна прынесла дакументы, з якіх вынікае, што пры ўзвядзенні ліўневай каналізацыі па чыімсьці недаглядзе абышлі яе дом. А цяпер жанчыне прапануюць правесці камунікацыі за ўласны кошт. Усім суседзям зрабілі бясплатна, адной прапануюць заплаціць. Сапраўды абсурдная сітуацыя. Буду накіроўваць дэпутацкія запыты з тым, каб дапамагчы жанчыне.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

Фота Івана ДЗЯТЛОВІЧА.

ДОБРАЯ НАВІНА

Новы дом для бібліятэкі

Астравецкая дзіцячая бібліятэка атрымала новае памяшканне ў будынку, створаным сіламі будаўнікоў атамнай электрастанцыі.

— Веру, што ні тэлебачанне, ні інтэрнэт не заменяць вам стасункаў з кнігай, бо яна — самы надзейны, блізкі і дасведчаны таварыш, а таксама цярплівы настаўнік, які дапамагае пазнаваць свет, — звярнулася да школьнікаў намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце РУП «Беларуская атамная электрастанцыя» Марына ПЫЛІНСКАЯ, якая перадала дырэктару бібліятэкі сімвалічны ключ ад будынка.

Віктар СВІЛА, намеснік старшыні Астравецкага райвыканкама ўручыў бібліятэцы два камп'ютары.

— Бібліятэка — вялікі і добры падарунак ад АЭС нашаму гораду, якога мы даўно чакалі. Мы разлічваем, што налета тут з'явіцца цэлы сацыяльна-культурны комплекс.

З 1991 года ў храме кнігі разам з трыма супрацоўніцамі гаспадарыць цяперашні дырэктар бібліятэкі Таццяна ГІРДЗЕЙ, якая правяла для гасцей першую экскурсію па новых залах.

— Апошнія некалькі гадоў бібліятэка добра камплектуецца. У нас добрая падпіска на рускія і беларускія дзіцячыя выданні. Усё, што ёсць у фондах, запатрабавана.

Больш за 2000 чытачоў наведваюць бібліятэку звыш 20 000 разоў на год. З амаль 30 000 экзэмпляраў, што захоўваюцца ў фондах, 1300 з лішнім кніг з'явілася тут толькі на пачатку гэтага года. У тым ліку некалькі выданняў беларускіх пісьменнікаў, падораных навасёлам Выдавецкім домам «Звязда».

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

ХУТАР ПАД ЗНОС

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

На думку старшыні райсавета, варта распрацаваць праграму па зносе такіх дамоў. Ударнай сілай могуць стаць меліяратары. Яны будуць выкарчоўваць пні і зносіць дамы, поўнасцю культываваць участак для калгасных пасеваў. Нешта накшталт праграмы меліярацыі, якой была ахоплена ўся краіна некалькі дзесяцігоддзяў таму. Зараз той напрамак сцішыўся, але з'явілася не менш адказная задача — пазбавіцца ад тысяч трухлявых хат. З удзелам меліяратараў за 3—5 гадоў можна значна прасунуцца ў справе зносу старых будынкаў і прывесці ў парадак тэрыторыю. Суразмоўнік прывёў прыклад Зэльвенскага раёна, дзе прадпрыемствам меліярацыйных сістэм знесена 43 дамы ў вёсцы. Але пакуль кожны райсавет гэту работу вядзе па-свойму. Хтосьці на кіраўніка СВК націскае, хтосьці на сельсавет. А ў гэты час колькасць дамоў-прывідаў толькі павялічваецца.

Праўда, некаторыя ўсе ж атрымліваюць другое жыццё. Так, адзін з хутароў выкупілі мясцовыя прадпрымальнікі, уладкавалі домік паляўнічага з адпачынкам, развіваюць турызм. На іншых новыя ўладальнікі адкрываюць аграсядзібы. Гэта таксама перспектыўны напрамак, разважае старшыня Воранаўскага райсавета, бо на тэрыторыі раёна 28 вадаёмаў, прыгожыя мясціны. Пустуючыя хаты ў такіх вёсках гараджане пачалі выкупляць пад дачы. Попытам карыстаюцца дамы на мяжы з Лідскім раёнам.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

> З удзелам меліяратараў за 3—5 гадоў можна значна прасунуцца ў справе зносу старых будынкаў і прывесці ў парадак тэрыторыю.

Ёсць прыклады, калі дзеці праз некаторы час засяляюцца ў дамы бацькоў. Так здарылася з сям'ёй з Літвы, якая вярнулася на радзіму. Яны адразу заняліся гаспадаркай, завялі карову, затым яшчэ некалькі. Малако здаюць у калгас і маюць добры прыбытак...

Маргарыта УШКЕВІЧ. *margo@zviazda.by*

• У ТЭМУ:

Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:

— У вобласці ствараецца рабочая група для вырашэння праблемы незаселеных дамоў, якіх у нас 47 тысяч, ці 27% ад агульнай колькасці. Асноўная праблема — у нашчадках, многія з якіх жывуць за мяжой, а на знос пабудовы патрэбен іх дазвол. Па шасці тысячах дамоў няма ніякіх апавяшчэнняў ад уладальнікаў — тут будзе весціся работа па зносе, бо часта пустуючыя дамы становяцца прытулкам бамжоў, базай для кантрабанды, ствараюць пажаранебяспечныя сітуацыі. Каб паскорыць знос такіх аб'ектаў, вядзецца работа па ўдасканальванні ўказа №100.

На прадпрыемстве «Гроднамеліявадгас» паведамілі, што пры наяўнасці дакументаў яны выконваюць работы па зносе старых дамоў. Калі такі заказ паступае, спецыялісты выязджаюць на месца, пасля чаго складаюць каштарыс. Праўда, аб'ёмы пакуль невялікія. У гэтым годзе такіх заказаў ад сельскіх Саветаў пакуль не было, хоць магутнасці для работы ёсць — філіялы прадпрыемства створаны амаль у кожным раёне вобласці. Яны гатовы падключыцца да сістэмнай работы па зносе трухлявых дамоў, была б толькі прапанова.

НАВІНЫ З РЭГІЁНАЎ

Гомельская вобласць

ВЯРНУЦЬ У АБАРОТ

З лістапада 2016 па люты 2017 года колькасць аб'ектаў нерухомасці, што знаходзяцца на балансе дзяржаўных органаў і прадпрыемстваў і пры гэтым не выкарыстоўваюцца, зменшылася на 20%. Такую інфармацыю агучыў абласны тэрытарыяльны фонд дзяржаўнай маёмасці. Яшчэ ў кастрычніку колькасць незадзейнічаных аб'ектаў складала больш за 5000. З таго часу больш за 800 з іх было вернута ў гаспадарчы абарот або знесена. Найбольш актыўна гэтая работа ідзе ў Добрушскім, Жлобінскім, Кармянскім, Лоеўскім і Чачэрскім раёнах.

Каля паловы выяўленых дзяржаўных аб'ектаў плануецца прадаць сёлета. 30 пабудоў ужо рэалізавана праз аўкцыёны. Акрамя таго, падчас праверак было выяўлена 1000 адзінак нерухомасці, якая не выкарыстоўваецца і пры гэтым знаходзіцца ў прыватнай уласнасці. У выпадку, калі невыкарыстанне такіх будынкаў у гаспадарчай дзейнасці даказана, падатак на нерухомасць і зямельны падатак з іх уласнікаў спаганяецца ў дзесяціразовым памеры.

Завяршыць рэалізацыю праекта па прыцягненні нерухомасці ў гаспадарчую дзейнасць плануецца на працягу 2017 года.

Пастаўскі раён

АЎТОБУС ПА ЗАЯЎКАХ

Эканамічная сітуацыя прымушае супрацоўнікаў транспартнай галіны больш гнутка падыходзіць да абслугоўвання насельніцтва. Цяпер у шэраг населеных пунктаў аўтобус пастаўскага Аўтатранспартнага прадпрыемства №17 заязджае толькі па папярэдніх заяўках мясцовых жыхароў. Такія захады ўжываюцца для эканоміі сродкаў. Таксама прадпрыемства знізіла кошт праезду па маршруце «Паставы — Мінск». Пры гэтым, па словах кіраўніцтва, выручка захавалася на ранейшым узроўні: дзяржаўным транспартам стала карыстацца больш пасажыраў.

Гродзенская вобласць

БОЛЕЙ ЭКСКУРСІЙ, ЦІКАВЫХ І РОЗНЫХ

За два месяцы 2017 года школьнікі Гродзеншчыны выязджалі на экскурсіі ў пяць разоў часцей, чым за аналагічны перыяд летась. За студзень і люты адбылося амаль 5000 выездаў з мэтай наведвання музеяў, помнікаў архітэктуры і прыроды, а таксама прадпрыемстваў. Большая частка паездак адбывалася ў межах вобласці. Школы рэгіёна арыентаваныя на тое, каб кожны вучань раз на чвэрць пабываў на якой-небудзь пазнаваўчай экскурсіі. Гэта не абавязкова далёкія падарожжы: перш за ўсё стаіць задача вывучыць сваю малую радзіму і краіну. Усяго ў Гродзенскай вобласці дзейнічае 345 установ агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх навучаецца больш за 112 тысяч школьнікаў.

Фота БЕЛТА.

Віцебская вобласць

ЖЫЦЬ СТАЛА ЛЕПЕЙ

У рэгіёне падвялі вынікі добраўпарадкавання за 2016 год. Усяго на паляпшэнне якасці жыцця выдаткавана 23 млн рублёў, з іх 5 — з абласнога бюджэту. У сельскагаспадарчы абарот прыцягнута 1650 га зямель, што выкарыстоўваліся неэфектыўна. Адрамантавана пакрыццё 400 км аўтадарог. Усталявана каля 1,5 тыс. кантэйнераў для раздзельнага збору смецця, у тым ліку каля 500 — у сельскай мясцовасці.

Аналізуючы вынікі працы па добраўпарадкаванні, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў падкрэсліў, што Віцебшчына мае на мэце стаць прыгожым кутком, дзе будзе камфортна не толькі яе жыхарам, але і гасцям. Для гэтага, на думку старшыні, не патрабуецца вялікіх фінансавых укладанняў. Галоўнае, каб органы мясцовага кіравання і самакіравання, прадпрыемствы і арганізацыі, а таксама жыхары планамерна выконвалі пастаўленыя задачы.

У той жа час застаецца нявырашаным шэраг праблем. У многіх садовых таварыствах на тэрыторыі вобласці не арганізаваны вываз смецця. Найбольш праблемнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца Бешанковіцкі, Мёрскі, Пастаўскі, Шаркаўшчынскі і Шумілінскі раёны. Экалогіі рэгіёна таксама пагражаюць зараснікі баршчэўніка Сасноўскага. Шкодная расліна мусіць быць знішчана да пачатку мая-чэрвеня, калі пачынаецца яе цвіценне.

Брэсцкі раён

СПОРТПЛЯЦОЎКА ЗА ГРОШЫ ЕС

Больш за 16 тысяч еўра са сродкаў Еўрасаюза сёлета выдзяляецца на стварэнне спартыўнага цэнтра на базе тутэйшай сярэдняй школы. «Спартыўная пляцоўка будзе пабудавана на тэрыторыі школы, — расказаў СМІ **старшыня сельскага Савета Уладзімір ХВАЦІК**, — але карыстацца ўсталяванымі трэнажорамі змогуць усе жыхары Дамачава і 14 вёсак, што знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета».

Дамачаўскі сельсавет стаў адным з пераможцаў конкурсу праекта ЕС/ПРААН «Садзеянне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». На выйграны грант будуць пабудаваны варкаўт-пляцоўка з трэнажорамі пад адкрытым небам, зоны экалагічнага выхавання і адпачынку.

Гэта не першы грант, атрыманы Дамачавам ад Еўрасаюза. Адзін з папярэдніх праектаў дазволіў адрадзіць дамачаўскія кірмашы, што былі вядомыя яшчэ з XVIII стагоддзя. Усяго сёлета сродкі ад ЕС на агульную суму 431 тыс. еўра атрымаюць 22 ініцыятывы з Брэсцкай вобласці.

Мінская вобласць

БЕСПРАЦОЎНЫМ ДАПАМОГУЦЬ

На базе тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва на Міншчыне адкрыліся кансультацыйныя пункты па пытаннях працаўладкавання. Кожны грамадзянін можа атрымаць у іх інфармацыю аб вакансіях, заработнай плаце і ўмовах працы. Саіскальнікам, якія звяртаюцца па інфармацыю, дапамагаюць звязацца з кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый і нават запісацца на гутарку.

У рэгіёне таксама мяркуецца распачаць кірмашы вакансій.

ЮНЫЯ ПАРЛАМЕНТАРЫІ З ЛЁЗНА

Як у невялікім мястэчку моладзь дапамагае мясцовым уладам

Сёння ў беларускай моладзі ёсць шмат магчымасцяў выказацца. Ёсць сацыяльныя сеткі, але віртуальныя звароты не даюць такога эфекту, як жывыя зносіны. Каля 10 гадоў у Беларусі існуе праект, які дазваляе таленавітым маладым беларусам не толькі гаварыць, але і рэалізоўваць сябе ў грамадскай дзейнасці, — Маладзёжная палата. Як яна функцыянуе і якую рэальную сілу мае такое аб'яднанне — наш карэспандэнт высветліў на прыкладзе Маладзёжнай палаты пры Лёзненскім раённым Савеце дэпутатаў.

Члены Маладзёжнай палаты 3-га склікання.

Што? Дзе? Навошта?

Маладзёжная палата ў Лёзне пачала дзейнічаць у снежні 2010 года і стала пілотным праектам на Віцебшчыне. «Гэта 27 прадстаўнікоў школ Лёзненскага раёна, якія ўдзельнічаюць у сесіях, прадстаўляюць інтарэсы моладзі, уносяць прапановы ў органы мясцовага самакіравання Лёзненскага раёна па пытаннях маладзёжнай палітыкі, праводзяць тлумачальную работу сярод моладзі. Палата створана для папулярызацыі мясцовага самакіравання, — адзначыла **галоўны спецыяліст аддзела па ідэалагічнай рабоце, культуры і справах моладзі Лёзненскага райвыканкама Ірына КУДРАЎЦАВА**. — Школьнікі знутры бачаць сістэму кіравання, удзельнічаюць у пасяджэннях раённага Савета дэпутатаў, маюць магчымасць прапанаваць уласнае рашэнне праблемных пытанняў. Я ўпэўнена, такое аб'яднанне — добрая школа для падрыхтоўкі будучых кадраў, у тым ліку кіруючых».

Выбары ў Маладзёжную палату праводзяцца па аналогіі з выбарамі ў органы мясцовага кіравання і самакіравання. У кожнай школе ініцыятыўныя хлопчыкі і дзяўчаткі, якія валодаюць арганізатарскімі здольнасцямі і жадаюць паспрабаваць свае сілы ў падобным аб'яднанні, прадстаўляюць свае праграмы. На агульным сходзе школы вучні галасуюць за найбольш цікавую, а аўтар, які набірае найбольшую колькасць галасоў, становіцца членам палаты. Кіруе Маладзёжнай палатай старшыня, які абіраецца шляхам адкрытага галасавання з ліку абраных членаў.

Асноўныя формы дзейнасці Маладзёжнай палаты — гэта работа ў пяці пастаянных камісіях: па грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі і прафілактыцы правапарушэнняў, па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, прапагандзе здаровага ладу жыцця. Яшчэ ёсць камісіі па пытаннях экалогіі, развіцці валанцёрскага руху і сувязях з грамадскімі арганізацыямі, па арганізацыі вольнага часу і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў для моладзі і па пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі і прафарыентацыі школьнікаў.

Яны таксама ўдзельнічаюць у пасяджэннях, якія праходзяць раз на квартал, і ў сесіях — раз на паўгоддзе. На сесіях падводзяцца вынікі работы, разглядаюцца і абмяркоўваюцца праекты рашэнняў.

Маладыя — раяць, улада — падтрымлівае

Трэба адзначыць: рашэнні, што прымаюцца на сесіях, носяць рэкамендацыйны характар, аднак яны заўсёды бяруцца ўладай пад увагу. Па словах **першага сакратара Лёзненскай раённай арганізацыі БРСМ Наталлі БІЗУНКОВАЙ**, палатай уносяцца і рэалізуюцца шматлікія прапановы. Вялікая ўвага ўдзяляецца добраўпарадкаванню і навядзенню парадку на зямлі. Напрыклад, па ініцыятыве ўдзельнікаў палаты ў рамках праекта «Двары для дзетвары» на тэрыторыі раёна былі арганізаваны 4 дзіцячыя пляцоўкі, якія абсталёўваліся разам з камунальнікамі, работнікамі лясгаса, жыхарамі дамоў. Прычым іх не проста зрабілі і забылі: яны і цяпер падтрымліваюцца ў належным стане.

— На высокім узроўні працуюць і валанцёрскія атрады, — адзначыла Наталля Бізункова. —

> У кожнай школе ініцыятыўныя хлопчыкі і дзяўчаткі, якія валодаюць арганізатарскімі здольнасцямі і жадаюць паспрабаваць свае сілы ў падобным аб'яднанні, прадстаўляюць свае праграмы.

Члены Маладзёжнай палаты з дапамогай органаў мясцовай улады і кіраўнікоў арганізацый раёна ў снежні 2016 года арганізавалі дабрачынны марафон, падчас якога быў наладжаны канцэрт і аказана дапамога грашамі і падарункамі сарака хлопчыкам і дзяўчаткам з абмежаванымі магчымасцямі.

